Іваненка В.М., студ. гр. 412 ФК і СКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Мышкавец А.А.,
канд. пед. навук, дацэнт

# АБРАД КАЛЯДАВАННЯ ЯК СРОДАК ВЫХАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ПАДЛЕТКАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўная ідэалогія ставіць сёння на першае месца выхаванне патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, любові да роднай зямлі. Вырашэнне гэтай задачы не магчыма без звароту не толькі да славутай гісторыі і сучаснасці нашага народа, але і да яго традыцыйнай культуры і багатай фальклорнай спадчыны.

Каляндарная і сямейна-бытавая абраднасць, звычаі, святы і традыцыі дапамагалі нашым продкам годна жыць, выхоўваць сваіх дзяцей, перадаваць новым пакаленням жыццёвы вопыт і мудрасць.

У каляндарна-абрадавай творчасці сфармуляваны маральна-этычны ідэал народа. Ён уключае такія фундаментальныя рысы характару чалавека, як працавітасць, сумленнасць, талерантнасць, якімі ва ўсім свеце славяцца беларусы.

Вядомы вучоны, фальклярыст А.С. Фядосік адзначае, што вялікая роля ў духоўным быцці этнасу, яго працоўным побыце, з аднаго боку, і высокая паэтычная культура слова, з другога, забяспечылі каляндарна-абрадаваму фальклору фенаменальную жыццяздольнасць. Ён да нашага часу застаецца элементам сучаснай культуры шырокіх мас народа, знакавай з’явай іх творчых магчымасцей [3, с 12].

Фальклор удала спалучае ў сабе мноства відаў мастацтва (вуснае слова і народны тэатр, музыка, песня і танец) таму ён можа быць цудоўным сродкам

развіцця творчых здольнасцяў дзяцей, нягледзячы на іх прыродныя дадзеныя і ўзровень агульнага развіцця.

Фальклор - надзейны захавальнік роднай мовы і генетычных каранёў нацыі, ён хутка развівае дзяцей, выхоўвае добры мастацкі густ, пачуццё гумару і калектывізму, вяртае да роднага культурна - этнічнага асяроддзя.

Сярод традыцыйнай каляндарнай абраднасці беларусаў асаблівую прыгажосць, вобразнасць, паэтыку і тэатралізацыю маюць калядныя абрады. А сярод іх найбольшую цікаўнасць для нас ўяўляе абрад калядавання, як адна з самых арганічных састаўляючых Каляд – цыкла свят зімовага сонцавароту. Усе ўсходнеславянскія народы святкуюць Каляды з 24 снежня па 6 студзеня па старому стылю (з 6 па 19 студзеня па новаму стылю). Гэты час беларусы называлі яшчэ “святыя вечары” або “святыя дні”. Падчас Каляд наладжваліся тры куцці, святочныя ігрышчы і вечарыны, людзі варажылі пра ўраджай і дабрабыт сям’і, дзяўчаты хадзілі шчадраваць, таксама бытавалі сярод моладзі гульні: “Яшчур”, “Жаніцьба Цярэшкі” і іншыя.

Ідэі дасягнення дабрабыту як гаранту працягу жыцця сям’і, роду, соцыуму праз магію слова, воброзна інтэрпрэтуюцца ў вітальна–велічальных песнях і паэтычных зваротах абрадавай дзеі Каляд.

У наш час шматлікія вучоныя, фалькларысты і этнографы Беларусі займаюцца збіраннем традыцыйнай вуснай паэтычнай творчасці беларусаў, даследуюць асаблівасці абрадавых дзеянняў кожнага з этнаграфічных рэгіёнаў, вывучаюць народны каляндар, прыкметы і павер’і. Сярод іх А.Ю. Лозка, М.А. Козенка, Т.Б. Варфаламеева, Г.А. Барташэвіч, а таксама выкладчыкі універсітэта культуры Т.А. Пладунова, І.І. Крук, Н.І. Гуд, П.А. Гуд і многія іншыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Актуальнасць узятай тэмы абумоўлена цікаўнасцю насельніцтва нашай краіны, асабліва моладзі, да старадаўніх нацыянальных традыцый. У наш час грамадства праяўляе інтарэс да нацыянальнай гісторыі і культуры, да фальклору і традыцыйных абрадаў. Ідзе працэс абуджэння нацыянальнай свядомасці і гістарычнай памяці беларусаў, адраджэння народных традыцый і святаў. Сучасная школа актыўна ўключаецца ў гэты працэс, добра разумеючы, што патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі пачынаецца з нацыянальнай самасвядомасці, з любові да сваёй зямлі, свайго народа і яго культуры.

Гаворачы пра спецыфіку падлеткавага ўзросту, трэба адзначыць, што ён, як этап псіхічнага развіцця, характарызуецца выхадам дзіцяці на якасна новую сацыяльную пазіцыю, звязаную з пошукам асабістага месца ў грамадстве. Галоўная патрэба падлетка – знайсці сваё месца ў зносінах, быць значымым, што хутчэй за ўсё рэалізуецца ў групе равеснікаў, дзе праходзіць праігрыванне самых розных бакоў чалавечых адносін, пабудова ўзаемаадносін, заснаваных на кодаксе сяброўства, рэалізуецца імкненне да глыбокага ўзаемапаразумення.

Падлеткавы ўзрост з'яўляецца найбольш спрыяльным не толькі для развіцця творчых здольнасцяў і самаразвіцця, але і для выхавання патрыятычных пачуццяў, умення рэалізоўваць сябе ў падлеткавай групе і наладжваць дабразычлівыя адносіны не толькі з аднагодкамі, але і з настаўнікамі, што ў поўнай меры можа рэалізоўвацца праз удзел у абрадавых дзеяннях.

Абрад калядавання – адзін з самых прыгожых традыцыйных народных абрадаў. У яго аснове закладзена імкненне чалавека змяніць да лепшага навакольны свет і сваю асабістую долю. Абрад калядавання, ў адпаведнасці з маральна-этычнымі і эстэтычнымі поглядамі народа, вылучае працу як урачыстую і адказную справу, як абрадавае дзеянне ад якога залежыць будучае – дабрабыт, шчасце і само жыццё. Абрад калядавання падабаецца падлеткам і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выклікае сапраўдную цікаўнасць. Тым больш, што дзіцячыя і падлеткавыя калядныя гурты заўсёды вельмі дабразычліва і шчыра сустракаюць людзі, а дзеці ў сваю чаргу, адчуваючы гэтую шчырасць, атрымліваюць сапраўднае задавальненне і яшчэ доўгі час жывуць тым узнёслым настроем.

Вось як ўспамінае пра абрад калядавання былая вучаніца Вілейскай гімназіі № 2 Ксенія Кананава: «На ўсё жыццё застанецца ў памяці, як мы хадзілі калядаваць. З школьнага двара выходзіла некалькі гуртоў калядоўшчыкаў з прыгожымі зоркамі на высокіх шастах і стужкамі. Гурты ішлі ў розныя бакі ад школы, ігралі гармонікі, і мы гучна спявалі. За кожным гуртом выстраіваліся групы зацікаўленых гараджан. Многія прасілі зайсці да іх і паспяваць дома. Людзі плакалі ад радасці».

Не толькі сам абрад, але і падрыхтоўка да калядавання згуртоўваюць падлеткавы калектыў, даюць магчымасць праявіць самыя розныя творчыя здольнасці. Шыццё касцюмаў і выраб масак, падрыхтоўка рэквізіту і абрадавай атрыбутыкі, напісанне сцэнарыя і яго падрыхтоўка – усё гэта дапамагае сучасным хлопцам і дзяўчатам вывучаць традыцыйную культуру свайго народа, больш глыбока і асэнсавана падыходзіць да гісторыі роднай краіны, засвойваць мову і тыя падсвядомыя этнічныя рысы, якія стануць падмуркам для выхавання сапраўднага патрыёта, грамадзяніна, сем’яніна і працаўніка.

Сцэнарый каляднага абрадавага дзеяння лепш распрацоўваць разам з падлеткамі, размяркоўваючы ролі так, каб кожны ўдзельнік гурта мог праявіць свае здольнасці і мець поспех, што будзе добрым стымулам яго асабістага развіцця і далейшай працы ў творчым калектыве.

Такім чынам, велізарныя развіваючыя і выхаваўчыя магчымасці фальклору не толькі адпавядаюць прынцыпам гуманістычнага выхавання, але і служаць добрай школай жыццёвых зносін і развіцця творчых і камунікатыўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здольнасцей. Наогул, фальклор уяўляе сабой прыродную сістэму інтэрактыўнай арттэрапіі, якая ўключае вылечванне гукам, музыкай, рухам, драмай, малюнкам, фарбай і нясе скрытыя інструкцыі па захаванні цэласнасці чалавечай асобы, закладваючы сапраўдны падмурак нацыянальнай самасвядомасці і патрыятызму.

Выкарыстаная літаратура:


1. Грудзінскі, М.У. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў сродкамі народнай педагогікі: (з вопыту работы этнашкол Мінск. вобл.): вучэб. – метад. дапам. / М.У. Грудзінскі, А.С. Вярынская. – Мінск, УА “Мінск. дзярж.абл. ін-т павышэння кваліфікацыі і перападрыхт. кадраў”, 2008. – 110 с.
2. Козенка, М.А. Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып. 2. Матэрыялы ІІІ Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (19 – 20 крас. 2006 г., г.п. Акцябрскі) / аўт. праекта і ўклад. М.А. Козенка. – Мінск: БелДІПК, 2006. – 224 с

Фядосік, А.С. Каляндарна-абрадавая паэзія / А.С. Фядосік, А.С. Ліс, А.І. Гурскі, В.М. Шарая, У.М. Сівіцкі. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 515 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ